# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Электронны вучэбна-метадычны комплекс (ЭВМК) дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» складзены ў адпаведнасці з дзеючай вучэбнай праграмай (рэгістрацыйны № УД-51-14/вуч. ад 28.06.2017) і на аснове Палажэння аб электронным вучэбна-метадычным комплексе УА «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.В. Сухога» (№302 ад 17.07.2017).

***Мэта*** ЭВМК «Беларуская мова: прафесійная лексіка» – забеспячэнне тэарэтычнай і практычна-арыентаванай падрыхтоўкі студэнтаў тэхнічных спецыяльнасцей дзённай і завочнай форм навучання.

***Задачы*** ЭВМК – даць паняцце, замацаваць і аўтаматызаваць веды навучэнцаў у напрамку спецыяльнай і тэрміналагічнай лексікі, лексічных, словаўтваральных, марфалагічных нормаў сучаснай беларускай мовы; пазнаёміць з асаблівасцямі развіцця і выкарыстання спецыяльнай лексікі; садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых і крытычна думаючых спецыялістаў.

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» выкладаецца на нефілалагічных факультэтах вышэйшых навучальных устаноў і з'яўляецца на першай ступені вышэйшай адукацыі адным са складнікаў цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, асноўная мэта якіх – фарміраванне і развіццё сацыяльна-асобасных кампетэнцый, што садзейнічае развіццю сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці.

Асноўнымі патрабаваннямі да кампетэнтнасці будучага спецыяліста з'яўляюцца патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый спецыяліста, у якіх спецыяліст павінен: умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэрэтычных і практычных задач; умець працаваць самастойна;

мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прыстасаванняў, кіраваннем інфармацыяй і працай з камп'ютарам; валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

Вывучэнне дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» студэнтамі тэхнічных спецыяльнасцей дзённай і завочнай форм навучання прадугледжана наступнымі формамі навучання: практычныя заняткі і самастойная работа, паколькі правядзенне лекцыйных заняткаў вучэбнай праграмай не прадугледжана. На вывучэнне дадзенай дысцыпліны адводзіцца аўдыторных гадзін – 34 для студэнтаў дзённага адзялення, 6 – для студэнтаў завочнага аддзялення поўнага тэрміну навучання, 4 – для студэнтаў завочнага аддзялення скарочанага тэрміну навучання.

ЭВМК «Беларуская мова: прафесійная лексіка» складаецца з вучэбнай праграмы па дысцыпліне і чатырох асноўных раздзелаў: тэарэтычны, практычны, кантролю ведаў і дапаможны.

***Тэарэтычны раздзел*** утрымлівае мультымедыйныя прэзентацыі важнейшых пяці тэм у адпаведнасці з вучэбнай праграмай. Дзякуючы зместу гэтых выдзеленых тэм студэнты атрымаюць тэарэтычныя звесткі, якія дапамогуць авалодаць неабходнымі ўменнямі і навыкамі.

Бібліятэка ГДТУ імя П.В. Сухого

У прадстаўленых тэмах выдзелены пытанні для абмеркавання, спісы ключавых паняццяў і тэрмінаў, раскрыты асноўныя палажэнні і змест, а ў заключэнні кожнай тэмы падаюцца пытанні для самакантролю. Асобна прадстаўлена асноўная і дадатковая літаратура, якая можа выкарыстоўвацца студэнтамі пры авалодванні тэарэтычным і практычным матэрыялам.

***Практычны раздзел*** уключае планы і заданні да практычных заняткаў. У працэсе самастойнага выканання розных заданняў студэнты набываюць навыкі работы з лексічным і тэкставым матэрыялам, вучацца аналізаваць іх і фармуляваць вывады. Практычны матэрыял арыентаваны на замацаванне тэарэтычных звестак па важнейшых тэмах дысцыпліны.

***Раздзел кантролю ведаў*** змяшчае тэсты па пяці важнейшых тэмах дысцыпліны, заданні да кантралюемай самастойнай работы студэнтаў (КСРС), пытанні да заліку, руска-беларускі лексічны мінімум тэхнічных тэрмінаў.

***Дапаможны раздзел*** прадстаўлены кароткім руска-беларускім слоўнікам тэхнічных тэрмінаў, тэкстамі для перакладу, тэмамі вусных паведамленняў і рэфератаў.

Электронны вучэбна-метадычны комплекс дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» адрасуецца студэнтам дзённай і завочнай формы навучання УА «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.В. Сухога» тэхнічных спецыяльнасцей.

Библиотека ГГТУ им.П.О.Сухого